МОЦНЫЯ ДУМКІ СПАРТАКА МІРАНОВІЧА 6

ЯКІ ЦЯЖКІ МЕТАЛ ЗАБРУДЗІЎ ПЛАНЕТУ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

28 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК

№ 124 (29746)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АБАРАНІЦЬ НАШУ АЙЧЫНУ АД БРЭСТА ДА УЛАДЗІВАСТОКА — НАШ НЕПАСРЭДНЫ АБАВЯЗАК»

Аб чым гаварылі лідары Беларусі і Расіі

Фота БелТА

На інфармацыйным парадку дня канца мінулага тыдня адной з найбольш рэзанансных тэм была сустрэча ў Санкт-Пецярбургу лідараў Беларусі і Расіі. Яна была прымеркавана да 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма дзяржавамі, але атрымалася зусім не пратакольным юбілейным мерапрыемствам. Ахоп тэм, якія закраналіся, надзвычай шырокі — ад пытанняў лагістыкі і эканамічнага супрацоўніцтва да рэагавання на пагрозы ваеннай бяспекі і ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях. У полі зроку кіраўнікоў дзяржаў застаюцца і пытанні, звязаныя з будаўніцтвам Саюзнай дзяржавы, ход рэалізацыі намечаных мэт. Мы нагадаем, аб чым гаварылі лідары ў мінулую суботу.

АБ ЛАГІСТЫЦЫ І БУДАЎНІЦТВЕ БЕЛАРУСКАГА ПОРТА

Аляксандр Лукашэнка да сустрэчы азнаёміўся з ходам будаўніцтва беларускага порта ў Бронцы. Гэтую тэму ён узняў і на сустрэчы з расійскім лідарам: «Я пабываў у Бронцы, там, дзе мы плануем пабудаваць беларускі порт. Дзякуй за падтрымку. Вы адобрылі той праект будаўніцтва. Я паглядзеў. Мне вельмі прыемна было ўбачыць, што такое Кранштат. Твар у твар сутыкнуцца. Дамба, будаўніцтва якой скончылі пры велізарным вашым садзейнічанні. І паглядзець іншыя месцы. Наогул, паглядзець з вады, што такое Піцер. Для мяне гэта было вельмі важна. І карысна з пункту гледжання будаўніцтва партовай гаспадаркі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Нас задавальняе тое месца, якое пазначана і падтрымана вамі. Месца добрае. Мы ўжо паволі пачынаем там грузіць мінеральныя ўгнаенні. Думаю, там будзе самы магутны порт. Нават, можа быць, нам яго не хопіць. Але, як мы дамовіліся, там будзе відаць, калі спатрэбіцца пашырацца», — дадаў Прэзідэнт.

АБ ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННІ І РЭАЛІЗАЦЫІ 15 БУЙНЫХ ПРАЕКТАЎ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на сустрэчы з расійскім лідарам планаваў у тым ліку абмеркаваць пытанні эканомікі. «Традыцыйная наша тэма — імпартазамяшчэнне. Мы прапанавалі 15 буйных праектаў. Расійскі бок адобрыў іх. Вы нас падтрымалі ў плане сумеснага фінансавання гэтых праектаў. Калі ўсё пойдзе так, як мы запланавалі, у найбліжэйшы час мы пачнём выпускаць імпартазамяшчальную прадукцыю», — сказаў Прэзідэнт.

«Гэта значыць, тыя кампаніі з недружалюбных краін, якія пастаўлялі нам — у Расію і Беларусь — прадукцыю... Мы на працягу гэтага і наступнага года можам вырабіць сваю», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Прэзідэнт Расіі распавёў, што абмяркоўваў з кіраўніцтвам урада пытанні выдзялення крэдытных рэсурсаў, аб якіх была дасягнута дамоўленасць раней, накіраваных на тое, каб стварыць фінансавыя магчымасці для беларускіх прадпрыемстваў пачаць выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі. «І не толькі імпартазамяшчальнай, а для стварэння сваіх інжынерных прапрацовак, каб выйсці на больш высокі ўзровень таго, што Беларусі і Расіі трэба», — удакладніў Уладзімір Пуцін.

СТАР. 2

Беражыце сябе!

СЁННЯ І ЗАЎТРА — АРАНЖАВЫ ЎЗРОВЕНЬ НЕБЯСПЕКІ З-ЗА СПЯКОТЫ: ЧАКАЕЦЦА ДА +36

Гэтымі днямі сярэднясутачная тэмпература паветра на 4—8 градусаў перавысіць кліматычную норму

Як правіла, супергарачае лета ў нас надыходзіць у пачатку ліпеня. Сёлета яно ўдарыла па тэрмометрах у канцы чэрвеня. Месцамі па краіне будзе проста неймаверна горача, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Першы дзень максімальнай спякоты супадае з аўторкам. Днём месцамі, пераважна па паўночным усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер прагназуецца нявызначальны 3—8 м/с, удзень пры навальніцах з парывамі да 14 м/с. У гэты дзень надвор'е ў краіне будзе вызначацца ў асноўным воблачнасць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў вельмі цёплай паветранай масе, толькі днём па паўночным усходзе адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту. Чакаецца пераменная воблачнасць. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад плюс 29 градусаў да 34 цяпла, месцамі па поўдні **да плюс 36 градусаў**.

СТАР. 2

Карысны досвед

ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЦЁ, або Як дапамагчы паверыць у сябе?

Навучыць людзей з інваліднасцю жыць самастойна — адна з найважнейшых задач спецыялістаў цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Але ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян сталага ўзросту невялікага гарадка Кіраўска (што ў Магілёўскай вобласці) вырашылі пайсці далей і паставілі перад сабой амбіцыйную задачу навучыць маладых людзей са складанымі дыягназамі цалкам інтэгравацца ў жыццё грамадства, зарабляць грошы для сябе і сваёй сям'і і быць матэрыяльна незалежнымі.

Сучасны свет вельмі няпросты, і знайсці ў ім сваю дарогу складана нават маладым людзям, у якіх няма праблем са здароўем. А наяўнасць прыроджаных або хранічных захворванняў дадае «невядомых» у гэта і без таго складанае ўраўненне. Таму на пачатку дарослага жыцця кожнаму неабходна добразычлівая дапамога і падтрымка ўважлівых і адказных дарослых. І асабліва яна патрэбна маладым людзям з інваліднасцю.

СТАР. 3

КЛУБНІЧНЫЯ ДАЖЫНКІ

Фота Віталя ДРАЧКОВА.

Менавіта так можна назваць свята, якое на мінулыя выхадныя адзначалі ў клубнічнай сталіцы нашай краіны — вёсцы Дварэц Лунінецкага раёна. Ужо дзявяты год каля мясцовага Дома культуры ў канцы чэрвеня праводзяцца «Лунінецкія клубніцы». На вясёлае свята збіраюцца не толькі вяскоўцы, але і госці з усёй Беларусі. Бо дзе яшчэ ласавацца салодкімі ягадамі і адмысловымі пачастункамі, як не тут?

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«У канцы 2021 года ўсяго па краіне выдадзена больш за 100 тысяч зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва ці мяне гадоў. Адпаведна гэта тэмп: калі кожны жыльлы дом будзе як мінімум плюс-мінус 100 кв. м, то мы бачым патэнцыяльных 10 млн кв. м жылля менавіта ў індывідуальным выкананні. Па-ранейшаму дзеінічае Указ Прэзідэнта № 87 «Аб некаторых мерах па скарачэнні незавершаных будаўніцтвам незакансераваных жылых дамоў, дач», дзе прадугледжаны тэрмінь будаўніцтва і ўводу аб'екта ў эксплуатацыю. Гэты працэс можна расцягнуць да бясконцасці, таму так, тэрмінь ёсць, яны застаюцца, і гэты Указ працуе дзеінічаць. Больш за тое, прыняўшы Указ № 202 аб спрошчаным уводзе, мы, шчыра кажучы, пакінулі пакуль за дужкамі людзей, якія ўжо пачалі будаўніцтва, якія з прычыны пэўных аб'ектыўных абставін маглі атрымаць у спадчыну дамы, пабудаваныя з пэўнымі парушэннямі. Можа быць, нейкія прыбудовы даўно нехта зрабіў, і людзі, адпаведна, гэтыя дамы не могуць зарэгістраваць, ржанстраваць, у рэшце рэшт іх рэалізоўваць».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Больш за 80 % амерыканцаў незадаволены станам спраў у краіне

Большасць грамадзян Злучаных Штатаў лічаць, што на сёння справы ў іх краіне ідуць дрэнна. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны» са спасылкай на апытанне, праведзенае тэлеканалам CBS.

Апытанне было праведзенае 24—25 чэрвеня пасля таго, як Вярхоўны суд ЗША прыняў рашэнне адмяніць канстытуцыйныя гарантыі на правядзенне абортаў. Рэспандэнты павінны былі даць ацэнку як гэтаму рашэнню, так і сітуацыі ў краіне ў цэлым. Вынікі апытання паказалі, што 81 працэнт грамадзян не ўхваляюць таго, як сёння ідуць справы ў іх краіне.

Раней паведамлялася, што 24 чэрвеня Вярхоўны суд ЗША адмяніў вынесеную ім жа 50 гадоў таму пастанову, паводле якой федэральныя ўлады гарантуюць правы на правядзенне абортаў. Пасля прыняцця такога рашэння адразу ў некалькіх гарадах Амерыкі прайшлі масавыя пратэсты.

У Германіі паведамілі пра кааліцыю супраць Захаду на чале з Расіяй і Кітаем

Антызаходні блок БРІКС на чале з Расіяй і Кітаем пашырае свой палітычны і эканамічны ўплыў, піша нямецкае выданне Die Welt.

«У той час як арыентаваная на Захад G7 прадстаўляе насельніцтва ў 771 мільён чалавек, больш за тры мільярды пражывае ў сямі краінах, якія супрацьстаяць ЗША і Еўропе», — сказана ў артыкуле.

Аўтар матэрыялу Стэфан Ост таксама дадаў, што эканамічныя сувязі краін антызаходняга блока будуць толькі ўмацоўвацца. Паводле яго слоў, Расія стала асноўным пастаўшчыком угнаенняў для Бразіліі, якая з'яўляецца другім экспарцёрам мяса ў свеце. Акрамя таго, у РФ расце колькасць кітайскіх аўтамабіляў, а індыйскія сеткі магазінаў адкрываюцца ў краіне ў найбліжэйшы час.

Раней прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заяўляў, што аўтарытэт БРІКС няўхільна расце год ад году. Ён падкрэсліў, што Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і ПАР паглыбляюць узаемадзеянне па ўсім парадку дня. Прэзідэнт назваў гэты працэс аб'ектыўным.

Дадон: Малдова можа пазбавіцца тэрыторый з-за русафобскай палітыкі, якая навязваецца Захадам

Экс-прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон лічыць, што рэспубліка можа пазбавіцца часткі сваіх тэрыторый з-за супрацьстаяння з Расіяй, якое навязваецца Захадам.

«З-за русафобскай палітыкі, якая праводзіцца сумесна з Захадам, мы не толькі страцім выгаднымі эканамічныя адносіны з партнёрамі на Усходзе, але і рызыкуем застацца без часткі нашых тэрыторый. Як вынік, Малдова як незалежная дзяржава можа знікнуць», — напісаў ён у Telegram-канале.

Па яго словах, палітыка Малдовы павінна грунтавацца на прынцыпах суверэнітэту і нейтралітэту, на выгадных адносінах з Усходам і Захадам і ўлічваць нацыянальны інтарэс.

Таксама Дадон заявіў, што Малдова атрымала статус кандыдата на ўступленне ў ЕС не дзеля эканамічнай падтрымкі, а каб быць уцягнутай у геапалітычныя гульні Захаду супраць Расіі.

КАРОТКА

- Цырымонія ўскладання вянкоў у гонар Дня Незалежнасці Беларусі і 78-й гадавіны вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбылася ўчора ў Маскве каля Магілы Невядомага Салдата каля Крамлёўскай сцяны.

- **МНС аператыўна рэагуе на існуючую абстаноўку ў рэгіёнах па розных напрамках. У Гомельскай вобласці ратавальнікі пачалі кантраляваць зоны адпачынку з вышыні.**

- Выстава аб жыцці і творчасці Янкі Купалы ў ваенныя гады «Шчаслівых перамог, свабоды мой народзе!» адкрылася ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры ўдзеле дзяржаўнага літаратурнага музея паэта. Кожная гістарычная дэталь, прадстаўленая на выставе, так ці інакш звязана з тэмай вайны. Сама назва выставы — адсылка да верша «Паўстаў народ», напісанага Янкам Купалам у 1941 годзе.

Незвычайнае ў звычайным

СІЛА КАХАННЯ, МОЦ ПРЫРОДЫ, БАГАЦЦЕ ГІСТОРЫІ

Чаму варта адправіцца ў край слаўных продкаў?

Чым прыцягвае ўнутраны турызм у Беларусі? Канешне, і цікавымі гісторыямі, і легендарнымі асобамі, і познавальнымі музеямі ды прыгожымі краявідамі. Але галоўная асаблівасць беларускага ўнутранага турызму ў тым, што ўсё гэта можна знайсці нават у маленькім мястэчку, звычайным раённым цэнтры. Невялікі горад памятае такія гісторыі, ад якіх захоплівае дух. А яго жыхары прыкладаюць усе намаганні, каб як мага цікавей прадставіць свае славутасці гасцям. Ім яшчэ многаму трэба навучыцца, але любоў да сваіх мясцін і жаданне іх вылучыць перакрываюць недахопы. Турыстычны прадукт дапамагае ўдасканаліць і Нацыянальнае агенцтва па турызме. Выязны семінар па Гродзенскай вобласці з прэзентацыяй турысцкага маршруту «Падарожжа ў край слаўных продкаў» — таму прыклад.

Гэты маршрут – выдатная ілюстрацыя незвычайнасці самых звычайных месцаў. Ён жа знаёміць з багатай і насычанай гісторыяй Гродзеншчыны ўсіх гасцей гэтага краю, якіх сёлета шмат, дзякуючы IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. А чым больш гасцей — тым лепш.

Карэспандэнты «Звязды» не маглі ўпусціць магчымасць бліжэй пазнаёміцца з Гродненскім рэгіёнам. Раскажаваем падрабязна, што незвычайнага ёсць у звычайным.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

«АБАРАНІЦЬ НАШУ АЙЧЫНУ АД БРЭСТА ДА УЛАДЗІВАСТОКА ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле яго слоў, урад Расіі згодны, што частка гэтых рэсурсаў можа і павінна быць выкарыстана беларускімі прадпрыемствамі, каб мець магчымасць вырабляць прадукцыю і для рынкаў трэціх краін. «У канчатковым выніку і Расія будзе ў гэтым зацікаўленая, маючы на ўвазе ўзровень нашай кааперацыі», — упэўнены кіраўнік расійскай дзяржавы.

АБ ПЫТАННЯХ АБАРОНЫ І АДПАВЕДНЫМ АДКАЗЕ НА ДЗЕЯННІ ЗАХАДУ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адпаведная тэматыка для краін крытычна важная ў сувязі з тым, што адбываецца на Захадзе.

«Нас вельмі хвалююць пытанні трэніроўчных палётаў самалётаў ЗША і НАТА, якія трэніруюцца несці ядзерныя боегалоўкі. Нас гэта вельмі напружвае. Таму я прашу вас разгледзець пытанне люстраного адказу на гэтыя рэчы. Без перабору. Вы трэніруюцца несці ядзерныя боегалоўкі. Вы, калі ласка, дапаможыце нам хаця б прыстасаваць нашы самалёты, якія ў нас ёсць, якія могуць несці ядзерныя зарады. Я не кажу аб тым, што мы заўтра перавязём (ці вы перавезяце) туды ядзерныя боепрыпасы. Але нам нельга жартаваць. Мы памятаем 1941-ы, калі нас закалыхвалі: «усё будзе добра, усё ціха, ніхто не нападзе». А потым аказалося не гатовыя да гэтага. Таму для нас вельмі сур'ёзная сітуацыя. Не першы раз стаўлю перад вамі гэтае пытанне. Ведаю, што вы разглядалі ў Міністэрстве абароны. Хацелася б пачуць, як будуць развівацца падзеі», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Я не хаваю, я стаўлю пытанне аб тым, каб мы маглі быць гатовыя да ўсяго, нават да выкарыстання самай сур'ёзнай зброі гатоў, каб абараніць нашу Айчыну ад Брэста да Уладзівастока. Гэта наш непасрэдны абавязак», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца трэніровачных палётаў авіяцыі ЗША і партнёраў па НАТА, то кіраўнік дзяржавы заўважыў: «Калі трэніруюцца, то, напэўна, нешта думаюць. Бо навошта трэніравацца?».

«Комплекс пытанняў абароны і бяспекі мы сур'ёзна павінны абмеркаваць, каб людзі нашы — расіяне і беларусы — разумелі, што яны знаходзяцца пад сур'ёзнай абаронай», — рэзюмаваў беларускі лідар.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін, кажучы аб пытаннях бяспекі, звярнуў увагу, што ў Еўропе ў амерыканцаў захоўваецца 200 ядзерных тактычных боезапасаў (у асноўным гэта атамныя бомбы), якія знаходзяцца ў шасці еўрапейскіх краінах — членах Паўночнаатлантычнага блока НАТА. «Для іх магчымага выкарыстання падрыхтаваныя 257 самалётаў, і не толькі амерыканскіх, але і гэтых згаданых мною краін», — растлумачыў Прэзідэнт Расіі.

Уладзімір Пуцін прапанаваў: «На ўзбраенні беларускай арміі знаходзіцца досыць вялікая групоўка самалётаў СУ-25. Іх можна было б даабсталяваць, праўда, гэтая мадэрнізацыя павінна быць праведзена на авіяцыйных заводах Расіі (мы з вамі дамовімся, як гэта зрабіць) і адпаведным чынам пачаць падрыхтоўку лётнага складу. Гэта першае».

«І другое. Як мы з вамі і дамаўляліся, вы ставілі пытанне аб гатэм, рашэнне ў нас прынята: на працягу найблізкіх пяці-шасці месяцаў перададзім Беларусі ракетна-тактычныя комплексы «Іскандэр-М», якія, як вядома, могуць прымяняць як балістычныя, так і крылатыя ракеты, прычым як у звычайным, так і ў ядзерным выкананні», — дадаў Уладзімір Пуцін. Ён прапанаваў даручыць міністрам абароны і начальнікам генеральных штабоў дзвюх краін прапрацаваць усе дэталі, звязаныя з гэтым.

«Так. Згодны абсалютна», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

ПРА ПАЛІТЫКУ КІРАЎНІЦТВА ПОЛЬШЧЫ І ЛІТВЫ

«Нас вельмі напружвае сітуацыя і тая палітыка, якую праводзяць нашы суседзі. Вы, увогуле, ведаеце. Гэта кіраўніцтва Польшчы і кіраўніцтва Літвы. Палітыка на канфрантацыю. І вам хапае ад іх. Асабліва ва Украіне апошнім часам наймітаў больш за ўсё, як мы заўважаем, з Польшчы. Я не разумею, навошта гэта ім трэба — канфрантацыя. Ясна, што за спінай стаяць, падштурхоўваюць, але палітыка агідная. Агрэсіўныя паводзіны», — сказаў беларускі лідар.

У гэтым жа плане дзейнічае і Літва, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «Апошнім часам нарастае паток інфармацыі з нагоды іх задумы спыніць транзіт з Расіі праз Беларусь у Калінінград, ізаляваць Калінінград. Слухайце, гэта падобна да абвяшчэння вайны. Недапушчальныя падобныя рэчы ў сучасных умовах», — сказаў ён.

ПРА ЖАДАННЕ БЕЛАРУСІ ПАВЫСІЦЬ СВОЙ СТАТУС У ШАС

Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы заявіў аб жаданні Беларусі павысіць статус краіны ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва: «Хачу з вамі пагаварыць з нагоды Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, дзе мы назіралі. Магчыма, параімся, вы падтрымаеце павелічэнне, пашырэнне нашага статусу. Часу ўжо прайшло нямала. Думаю, мы там лішнімі не будзем».

АБ ФОРУМЕ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ Ў ГРОДНЕ

На сустрэчы размова зайшла і аб маючым адбыцца ў Гродне на гэтым тыдні чарговым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі. «Абмяркуем пытанне правядзення Форуму рэгіёнаў. Думаю, што мы, як звычайна, прымем удзел у ім у выглядзе відэаканферэнцыі. Гэтыя форум праводзяць парламентарыі — верхнія палаты парламентаў у нас і ў Расіі. Яны добра арганізоўваюць і правядуць у Гродне вельмі добры форум», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Парламенцкі дзённік

ЗАКАНАДАЎЧЫЯ НАВАЦЫІ

Падтрымка дзяржаўных СМІ, палёгка для індывідуальных прадпрымальнікаў і прыцягненне інвестыцый

Акрамя таго, падчас чарговага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў дэпутацкім корпусам прыняты праект закона «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь за 2021 год».

Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла НІЖЭВІЧ**, на выкананне бюджэту 2021 года станоўчы ўплыў аказалі адначасненне эканамічнай актыўнасці эканомікі нашай краіны, рост экспарту і сусветных цэн на сыравінныя тавары. «Усё гэта дазволіла атрымаць дадатковы даход бюджэту 4,2 млрд рублёў, — удакладніла парламентарый. — Даходы рэспубліканскага бюджэту за 2021 год склалі 27,5 млрд рублёў, або 101,5 % удакладненага гадавога плана, што на 17,8 % вышэй за 2020 год».

У асноўным летась даход рэспубліканскага бюджэту фарміраваўся за кошт падаткоўных паступленняў. Расход бюджэту склаў 28,9 млрд рублёў. Усе сацыяльныя абавязацельствы і гарантыі выкананы ў поўным абъёме. Забяспечана выкананне знешняга і ўнутранага доўгу. Расходы на сацыяльную сферу з улікам дадатковых расходаў склалі 20 %. Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту скараціўся да аднаго мільярда рублёў супраць чатырох, якія першапачаткова былі зацверджаны Законам «Аб рэспубліканскім бюджэце».

У першым чытанні парламентарыі адобрылі законапраект «Аб зменені Бюджэтнага і Падаткоўага кодэксаў Рэспублікі Беларусь». Дакументам прадугледжана ўнясенне некаторых змяненняў у Бюджэтны кодэкс з мэтай прывядзення яго асобных артыкулаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, што ў дадзеных эканамічных ўмовах дазваляе забяспечыць устойлівае і збалансаванае выкананне бюджэту.

Акрамя таго, законапраектам забяспечваецца прывядзенне Падаткоўага кодэксу ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 31 сакавіка 2022 г. № 131 «Аб развіцці сродкаў масавай інфармацыі», якім уводзіцца збор за размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы, які спаганяецца з беларускіх юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў — рэкламадаўцаў. У сувязі з гэтым у Падаткоўы кодэкс уведзена новая глава — «Збор за размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы».

— Прэзідэнту даюцца паўнамоцтвы на змяненне Бюджэтнага кодэксу ў межах бягучага года і, адпаведна, пераносіць на пэўныя артыкулы неабходныя расходы, — патлумачыў сутнасць навацыі **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Сяргей СЦЕЛЬМАШОНАК**. — Яшчэ адна навела — спрашчэнне парадку адміністравання для індывідуальных прадпрымальнікаў. Законапраект прадугледжвае залічэнне штрафаў ад неплацельшчыкаў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва ў частцы страхавых узносаў. Цяпер гэтыя штрафы будуць залічвацца непасрэдна ў фонд, а не ў рэспубліканскі бюджэт, як было дагэтуль.

Падчас пасяджэння ў другім чытанні былі прыняты законапраекты «Аб зменені кодэксаў» і «Аб зменені закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве». Што датычыцца апошняга, прарыў законапраекта, па словах **члена Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Анатоля НАСЕНІ**, заключаецца ў тым, што працэдура вядзення перагавораў паміж дзяржаўным органам і прыватным партнёрам без правядзення конкурсу ажыццяўляцца не будзе. «Праўда, гэта датычыцца праектаў, на якія не прадугледжана бюджэтнае фінансаванне, — удакладніў дэпутат. — Сам гэты факт дазваляе значна паскорыць працэс: і ў плане прыняцця рашэння, і тэрміну рэалізацыі праектаў. Мы захавалі магчымасць прыняцця рашэнняў ад рэалізацыі дзяржаўна-прыватных рашэнняў на базавым узроўні: мясцовая ўлада валодае неабходнай інфармацыяй на месцах. Вядома, у іх будзе дадатковае жаданне рэалізаваць пабольш прыватных праектаў менавіта з прыватным партнёрам. Асноўная мэта законапраекта — дадатковае прыцягненне інвестыцый у нашу эканоміку».

Вераніка КАНЮТА.

«БЕЛАРУСЬ І САМАРСКАЯ ВОБЛАСЦЬ МАЮЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЦІ ВЫЙСЦІ Ў ГАНДЛІ НА $1 МЛРД»

Беларускі лідар сустрэўся з губернатарам Самарскай вобласці

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Самарскай вобласці Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Азаравым. Сустрэча адбылася ў рамках візіту дэлегацыі Самарскай вобласці ў Рэспубліку Беларусь. У цэнтры ўвагі сустрэчы кіраўніка дзяржавы і губернатара — эканамічнае супрацоўніцтва і абмен вопытам.

Беларускі лідар прапанаваў адразу вызначыць прыярытэтныя напрамкі сумеснай працы на найблізжэйшую перспектыву. Паколькі, па яго словах, час дыктуе вызначацца вельмі хутка.

Прэзідэнт прывёў статыстычныя даныя. У 2021 годзе таварааборот паміж Рэспублікай Беларусь і Самарскай вобласцю склаў практычна 700 мільёнаў долараў і павялічыўся амаль на 4 працэнты. Паказчыкі гэтага года знізіліся на 59 працэнтаў з прычыны скарачэння імпарту спецыфічных тавараў з Расіі. Пры гэтым беларускі эксперт паказвае добры прырост да мінулага года (больш за 20 працэнтаў). Цяпер айчынныя прадпрыемствы не толькі выконваюць свае абавязацельствы, але і значна перавышаюць аб'ёмы паставак запасных часткі і камплектуючых, ліфтавага абсталявання, мэблі, прадуктаў харчавання, лекаў і іншых тавараў.

«Мы рады таму, што мы ў поўным аб'ёме запатрабаваныя на расійскім рынку. Сёння ўжо не стаіць пытанне, як прадаць, як гэта было раней. Сёння стаіць пытанне, як задаволіць попыт, перш за ўсё нашай Расіі, вялізнай краіны па тых таварах, што мы вырабляем. Задача нашага ўрада — ні ў якім разе не адмовіць ні па адным з напрамкаў і не пакінуць кантрасты незадаволенымі. У апошнія дні мы шмат гаварылі аб гэтым з Прэзідэнтам Расіі, абмяркоўваючы імпартазамяшчэнне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён канстатаваў, што імпартазамяшчэнне сёння — пытанне нумар адзін. І гэты працэс будзе жорстка кантралявацца. «У адваротным выпадку мы і вы схільныя да цяганіны, бюракратызму. Усё вызначым, што трэба вырашыць, а потым, як пачнём рэалізоўваць, атрымліваюцца цуды. Мы гэтыя цуды бачым, і, я ашчэ раз падкрэслівае, з прэзідэнтам Расіі падвергнулі жорсткаму аналізу аж да таго, што былі даўпены адпаведным асобам распараджэнні», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар расказаў, што ў рамках сумеснай праграмы імпартазамяшчэння былі намечаныя да рэалізацыі 15 праектаў. З іх 10 праектаў — гэта тое, што Расіі трэба, а пяць праектаў — тавары, якія могуць пайсці на знешнія рынкі з Беларусі, гэта бышчам бы нецікава. Аднак і гэтыміпяццю праектамі зацікавіўся Уладзімір Пуцін, бо для таго, каб прадаць на знешніх рынках тавар, трэба яго ў Беларусі зрабіць. А там бальш за палову камплектуючых з Расійскай Федэрацыі. «І было прынята рашэнне без усялякіх агавораk тыя паўтара мільярда па імпартазамяшчэнні на Беларусь, выдзеленых з рэсурсаў Расіі, павінны быць неадкладна рэалізаваны. У адваротным выпадку мы прывядзём да таго, што выключам унутраную незадаволенасць людзей і паўторым тое, што было пры распадзе Савецкага Саюза. Памятаеце, калі з-за пральных парашкоў і кавалка хлеба мы спарадзілі незадаволенасць людзей, а потым нікчэмныя палітыкі дадалі, і краіна развалілася. І мы зараз пажынаем такі вынік. Гэтых памылак дапушчаць ні ў якім разе нельга», — растлумачыў Прэзідэнт.

ТРЭБА АБАПІРАЦЦА НА СВАІХ

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, і хоць у бягучым годзе цэны выраслі па незалежных прычынах, Беларусь практычна не знізіла тэмпаў імпарту з Самарскай вобласці. Беларускі бок стаў закупляць больш слыначнікавага алею, меднага дроту, падшыпнікаў. «І гэта далёка не поўны пералік прадукцыі, якую мы маглі б у вас набываць. Разлічваем, што ваш візіт у Беларусь дазволіць збалансаваць гандаль. Ад гэтага выйграюць усе», — упэўнены ён. Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу на закупкі слыначнікавага алею, якія варта ўжо сёння спланаваць: «Навошта кудысьці хадзіць далёка. Калі Самара выраблае і прадае, значыць, трэба там і купляць», — адзначыў ён.

Беларускі лідар упэўнены, што сёння ёсць усе магчымасці выйсці ў гандлі на паказчык у мільярд долараў. Трэба ўсяго толькі выканаць да кропкі і коскі тое, аб чым беларускі і расійскі бакі раней дамаўляліся на розных узроўнях. «Сёння само жыццё нас да гэтага падштурхоўвае, указваючы правільны і, можа, адзіны шлях. Трэба абапірацца на сваіх. Мы гатовы істотна нарасціць аб'ёмы паставак самай сучаснай аўтамабільнай, сельскагаспадарчай, дарожнабудаўнічай і камунальнай тэхнікі», — падкрэсліў ён.

Асобнай праблемай Аляксандр Лукашэнка назваў тэхніку для нарыхтоўкі лесу. Так здарылася, што па імпарце ні Беларусь, ні Расія тэхніку закупіць не могуць. Ён звярнуў увагу на тое, што ў апошнія гады ў Беларусі засвойваецца выцворчасць лесанарыхтоўчай тэхнікі. Але пакуль яе не паспелі вывесці на серыйную вытворчасць. «Я Прэзідэнту Расіі пра гэта расказваў. Мы без гэтага не абыдзёмся. Гэта наша другая нафта. І кай сёння гэта ўсё разгарнуць як імпартазамяшчэнне, трэба ад двухсот да двухсот пяцідзесяці мільёнаў долараў. Пуцін сказаў, што гэта цікавы праект, яго трэба вывучыць і абавязкова папулярызаваць. Трэба, каб гэты праект пайшоў. Магчыма, і Самарская вобласць знойдзе ў гэтым сваё месца», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што па ўмовах забеспячэння, сэрвісным абслугоўванні і фінансавым суправаджэнні Беларусь і Самарская вобласць змогуць дамовіцца. І апошнія месяцы аб гэтым сведчаць. Аляксандр Лукашэнка заклікаў лічыць надзвычай важным пошук новых магчымасцяў для пашырэння прамысловай кааперацыі (паводле яго слоў, інтарэс павінен быць поўным і працоўныя месцы павінны стварацца як у Беларусі, так і ў Самарскай вобласці), трансферу тэхналогій і экспарту паслуг.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, беларускім спецыялістам цікавыя даследаванні самарскіх навукоўцаў і экспертаў абаронна-прамысловага комплексу. Вельмі цікава і сёння запатрабавана. «Мы заўсёды гатовы падзяліцца назапашаным вопытам у развіцці аграрнага сектара, можам пашырыць — асартымент — паставак харчавання, удзельнічаць у праектаванні і ўзвядзенні сацыяльных і прамысловых аб'ектаў. Мы гатовы абменьвацца з вамі навуковымі дасягненнямі і іншымі тэхналогіямі», — сказаў ён.

УСЁ, ШТО ПААБЯЦАЕМ, ПАВІННА БЫЦЬ ЖАЛЕЗНА ВЫКАНАНА

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Беларусь мае магчымасць падзяліцца напрацоўкамі ў дарожным будаўніцтве. Ён ведае аб тым, што Самарская вобласць уваходзіць у дваццатку рэгіёнаў, якія больш за ўсё інвестуюць. «Калі вы ўбачыце нашу неабходнасць удзельнічаць у Самарскай вобласці ў якіх-небудзь работах, мы будзем удзячныя вам за гэта і будзем вельмі адказна выконваць гэтыя работы», — запэўніў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за эканомікай не трэба забываць і гуманітарную галіну, узаемадзеянне адукацыйных устаноў, дзеячаў культуры, работу ў інфармацыйнай сферы. Паводле яго слоў, трэба, каб у Самары ведалі, чым жывуць нашы людзі, і беларусы павінны ведаць, як развіваецца Самарская вобласць, таму тут без сродкаў масавай інфармацыі не абысціся.

«Прапаную падчас вашага візіту разгледзець усе напрамкі супрацоўніцтва, і вы павінны нам сказаць, што мы павінны і можам зрабіць для Самарскай вобласці. Адказных асоб, якія тут, пакуль ідзе перагавораў, што ўсё, што мы тут пабачаем, павінна быць жалезна выканана. Глядзіце, каб мы не сарвалі ніводны праект. Гэта не дабрачынніцтва. Мы да вашых паслуг, калі трэба недзе падстаўіць плячо, мы гэта гатовы зрабіць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Валерыя СЦЯЦКО.

Акцэнты

ПЕРАДЗЕЛ СВЕТУ НЕПАЭБЯЗНАСЦІ

Чаму ЗША ўсімі сіламі імкнуцца захаваць свае пазіцыі і за якую незалежнасць змагаецца Расія?

Маштабныя трансфармацыі, якія апошнім часам закранулі ўсе краіны, аказваюць значны ўплыў на сучаснае светаўладкаванне. Якім будзе свет, што зойме пазіцыі сусветных лідараў, як будзе развівацца эканоміка, з абсалютнай дакладнасцю мала хто бярэцца казаць. Важна разабрацца ў тым, што адбываецца цяпер, у канкрэтны гістарычны перыяд.

Аб спецыфіцы супрацьстаяння цэнтраў сілы ў XXI стагоддзі, глабальным расколе і фарміраванні макрарэгіёнаў, канфлікце цывілізацый, а таксама ролі ў ім палітычных і эканамічных эліт расказаў прафесар Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін, член Прэзідыума Савета па знешняй і абаронная палітыцы Расіі Андрэй БЯЗРУКАЎ. Эксперт-міжнародніе выступіў з дакладам падчас круглага стала «Геапалітыка і бяспека ў новым свеце», які адбыўся на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Наш карэспандэнт запісала самыя цікавыя моманты.

ПЕРЫЯД НЕСТАБІЛЬНАСЦІ

Па словах эксперта, мы ўступілі ў час гістарычнага пералому. Для таго каб разумець, што цяпер адбываецца, ён прапанаваў аўдыторыі вярнуцца на сто гадоў таму.

— Роўна сто гадоў таму адбываўся такі ж глабальны ўсёабдымны пералом, як цяпер, — адзначыў Андрэй Бязрукаў. — Ішла грамадзянская вайна, паслія Першай сусветнай, у якой загінулі чатыры імперыі. Потым быў 30-гадовы перыяд ад аднаго свету да іншага, які скончыўся стварэннем Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. І цяпер мы пражываем тыя ж тэндэнцыі, якія праходзілі раней.

Па меркаванні эксперта, мы пераходзім з аднаго тэхналагічнага цыкла ў іншы. «У 1914 годзе людзі ездзілі на павозах, а ў 1945-м ужо ажыццяўляліся транс-атлантычныя пералёты, — канстатаваў ён. — Прайшло 30 гадоў — свет абсалютна памяняўся. І цяпер мы бачым, што эканоміка пачынае хутка мяняцца, некаторыя краіны ідуць наперад, іншыя адстаюць. Як тады, калі Злучаныя Штаты і Германія развівалісі хутчэй, чым Англія і Францыя, якія раней трымалі ўсю сусветную сістэму. Цяпер Кітай, Азія цалкам вырываюцца наперад, развіваюцца хутчэй, і заходні свет, у першую чаргу Злучаныя Штаты, спрабуюць іх спыніць. Спыніць не проста Кітай, а ўвесь астатні свет, захаваць свае пазіцыі. У свой час падобнае імкненне скончылася сусветнай вайной. Цяпер пагляджым — мы таксама ўваходзім у гэты перыяд нестабільнасці».

Прафесар заўважыў, што перабудоўваецца ўся сацыяльная сістэма. «Мы зноў, як і сто гадоў таму, вярнуліся да такога ж катастрафічнага расслаення на багатых і бедных, на багатыя і бедныя краіны, — удакладніў ён. — Што кажуць палітыкі аб сённяшняй сітуацыі? Яны бачаць крызісы, якім ніяк не могуць даць рады. Крызісы накаліся адзін на аднаго, яны ўсёабдымныя, глабальныя. Мы бачым, што эканоміка з 2008 года не расце, што ўрады любой цаной спрабуюць абкласці людзей падаткамі, урэзаць сацыяльныя праграмы, якія ў мірныя гады аддавалі направа і налева. І ліберальная мадэль, якая была выбудавана, аптымізавана пад папярэдні тэхналагічны цыкл, ужо не працуе. Заходні свет траціць кантроль над незаходнім».

Па словах Андрэя Бязрукава, упершыню з часоў Калумба Захад страціў ваенна-тэхналагічную перавагу. «Першы раз за апошнія 500 гадоў гэтай перавагі няма, — падкрэсліў спікер. — Не проста таму, што, напрыклад, расійская і кітайская ваенныя машыны дастаткова моцныя. Калі паглядзець на многія іншыя прыклады, на тую ж Паўднёвую Карэю, то яна нічым не саступае Брытаніі па сваім ваенным патэнцыяле».

ЭФЕКТ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ

Але самы страшны крызіс, на думку эксперта, сацыяльны. «Ён заўсёды праходзіць нечакана, — удакладніў Андрэй Бязрукаў. — І цяпер, калі дзяржава адмовіла ў дабрабыце доўгажыхарам, калі няма больш грошай раздаваць усім, каб людзі жылі ціха і падтрымлівалі гэтую прыгожую дэмакратычную карціну, у гарадах з'яўляецца прыкарыят, што ад французскага азначае «на мяжы». Гэта маладыя, адукаваныя, дынамічныя людзі, якія сацыяльна арыентаваныя, сядзяць у сацыяльных сетках, але ў іх няма дакладных перспектыў, што будзе заўтра. У іх няма і стабільнай работы, на якой можна будаваць сям'ю, яны перабываюцца з аднаго на другое: то дастаўка, то Макдональдс, то яшчэ нейкая падпрацоўка, то непрацяглы кантракт. І гэтая выбуховаенебяспечная сумесь у вялікіх гарадах назапашваецца, і людзі гатовы выйсці на вуліцу па любой нагодзе: ці гэта брэксіт, Трамп або незалежнасць Каталоніі. Гэтая напружанасць павялічваецца ва ўсім. І гэта прыкмета таго, што сацыяльная сістэма будзе вельмі моцна мяняцца. Мы вярнуліся да перадзелу ўсяго астатняга свету».

Найбольш падрабязна прафесар слыніўся на Злучаных Штатах Амерыкі як краіне з найбольш развітой эканомікай, якая ўваходзіць у наступны тэхналагічны цыкл і першай пачынае адчуваць сацыяльныя і палітычныя змены. Паводзіны ЗША вельмі моцна адлюстроўваюцца на ўсіх астатніх. На словах Андрэя Бязрукава, яны цягнуць за сабой канфлікты, спрабуюць спыніць свет, каб ён больш не мяняўся.

— Злучаныя Штаты — гэта праект групы рэлігійных адшчапенцаў, якія зберглі з Еўропы, каб будаваць абсалютна іншае грамадства, якое не мае нічога агульнага з тым, што было ў Еўропе, — звярнуў увагу эксперт-міжнародніе. — Яны былі рэлігійнымі радыкаламі, адмаўлялі і тую сістэму дзяржавы, і тую рэлігію, якая дамінавала ў Еўропе. Для іх гэта быў праект барацьбы дабра са злом. Натуральна, яны былі «дабром», а ўсё астатняе — «злом». І ў іх пратэстанцкай рэлігіцы гэтую тэрыторыю «дабра» трэба было пашырыць. Спачатку яны пашырылі яе да Апалацкіх гор, потым сутыкнуліся з індзейцамі, французамі, затым дайшлі да Ціхага Акіяна і гэтак далей. У рэшце рэшт пасля Другой сусветнай вайны яны быццам бы сталі ўладарамі свету. Зноў-такі гэта праект пашырэння тэрыторыі «дабра».

Як адзначыў Андрэй Бязрукаў, для нас гісторыя — там, дзе мы знаходзім сябе. «У Злучаных Штатаў гісторыі няма, — дадаў ён. — Яна вельмі дробная, надуманая, лакальная. Што казаць, калі Вялікі тэатр у Маскве існуе даўжэй, чым Злучаныя Штаты. Яны будаваліся з розных кавалкаў. І для іх самым галоўным было тое, каб ніхто на іх не ціснуў, каб была незалежнасць. Дзяржава — гэта «зло», па іх меркаванні. Дзяржава павінна быць мінімальная. А для нас дзяржава — гэта ўсё, гэта стрыжань, які трымае тэрыторыю, ідэалогію, эканоміку. І ў нас людзі, якія стаяць на чале дзяржавы, прадстаўляюць яе. Яны з'яўляюцца вяршыняй дзяржавы. Там падпарадкоўваюцца правілам, а ў нас — асобам. Прычым гэта не толькі ў нас. Увесь Усход — гэта аб асобах. Увесь Захад — аб правілах».

ЗАХАД СТРАЧВАЕ ПАЗІЦЫІ

Выказаўся спікер і аб ваеннай аперацыі ва Украіне. Па яго словах, у дадзены момант Расія вядзе вайну за незалежнасць.

— Апошнія 30 гадоў Расія была залежнай краінай, — адзначае прафесар. — Гэтая залежнасць ёй была навязана: і культурная, і эканамічная, і фінансавая. Цяпер у Расіі ёсць шанц ад гэтай залежнасці вызваліцца. Так атрымалася, што гэта адбываецца сілавым шляхам. І гэтага немагчыма было б пазбегнуць. Спадзяюся, што ў выніку гэтага канфлікту так ці інакш будзе выбудаваны новы свет — больш шчыры і справядлівы. Астатні — незаходні — па сутнасці, ужо гэтага чакае. Паглядзіце на рэакцыю арабскага свету, на Кітай, Індыю. Увесь свет, які ніколі не быў вольны (гэта значыць каланіяльны свет), цяпер за нас.

На словах Андрэя Бязрукава, перш за ўсё, крызіс б'е па небагатых краінах. «У іх няма запасу трываласці, які ёсць, напрыклад, у Еўропы, Злучаных Штатаў Амерыкі, Кітая, нас у тым ліку, — заўважыў ён. — Любое ператрасванне сусветных рынкаў, любы рост цэн на прадукты б'е перш за ўсё па іх. І, вядома, наша задача — гэтыя небагатыя краіны падтрымаць, у тым ліку палітычна. Яны таксама шукаюць незалежнасць: сістэма абмену абсалютна неэквівалентная».

Гаворачы аб узмацненні інтэграцыйных сувязяў Беларусі і Расіі, прафесар акцэнтаваў увагу на тым, што і Беларусь, і Расія з'яўляюцца часткай адзінай прасторы. «І гэта незаходняя палітычная прастора, — падкрэсліў эксперт. — А цяпер, калі Захад, па сутнасці, вярнуўся да сваіх каланіяльных звычак, гэта не толькі пытанне Расіі і Беларусі — гэта пытанне ўвогуле інтэграцыі многіх краін для таго, каб пабудаваць новы свет — больш справядлівы і з іншай эканомікай. Заходні свет знаходзіцца ў меншасці. Гэта цяжкая сітуацыя, калі ён пачынае страчваць пазіцыі і за іх змагаецца. Усе астатнія шукаюць агульныя базы, у тым ліку Беларусь і Расія, каб выбудаваць абсалютна іншую эканамічную і палітычную сістэмы».

Вераніка КАНЮТА.

Надвор'е

СЁННЯ І ЗАЎТРА — АРАНЖАВЫ ЎЗРОВЕНЬ НЕБЯСПЕКІ З-ЗА СПЯКОТЫ: ЧАКАЕЦЦА ДА +36

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Другі дзень максімальная спякоты нам трэба будзе перажыць у серадзе 29 чэрвеня. У гэты дзень умовы надвор'я будзе вызначаць атмасферны фронт, які ссоўваецца з боку Фінскага заліва. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Уначы пераважна па паўночна-ўсходняй палове, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі навальніцы. Вецер усходняй чвэрці ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ноччу ад плюс 17 градусаў да 22 цяпла, днём ад 24 градусаў са знакам плюс, па паўночным усходзе да 34 спякоты па паўднёвым захадзе краіны, **месцамі па Брэсцкай вобласці 35—36 цяпла.**

У чацвер уначы захавалася ўплыў франтальнага падзелу, які сустрэчае актыўнасць, а днём краіна апынецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Таму ўначы ў асобных раёнах магчымыя кароткачасовыя дажджы, днём пераважна без ападкаў. Вецер усходняй чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра ўначы пачне трошкі «адпускаць» — будзе ўжо толькі ад плюс 14 градусаў да 21 цяпла. Днём спякота трохі спадзе — тэмпература паветра будзе ад плюс 26 градусаў па паўночным усходзе, да 34 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

А далей бярэ сваё правы ў рукі ліпень. На працягу тыдня ўжо не будзе прыпякаць да 36, але больш за 30 нам чакаць прыйдзецца дакладна.

І так, у першы дзень ліпеня будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—17 градусаў вышэй за нуль, на паўднёвым захадзе — 18—21 цяпла. Удзень будзе ад 27 цяпла па паўночным усходзе да 34 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У суботу ўначы тэмпература стане трошкі меншая, чакаецца — 13—20 цяпла. А ў суботу будзе пераважна без ападкаў. Тэмпературна паветра днём будзе трымацца ў раёне 28—34 спякоты.

Сяргей КУРКАЧ.

СІЛА КАХАННЯ, МОЦ ПРЫРОДЫ, БАГАЦЦЕ ГІСТОРЫІ

ЛЮБОЎ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Вёска Масаляны Бераставіцкага раёна — маленькі населены пункт, якіх на Беларусі тысячы. На першы погляд, нічога дзіўнага ў ім няма. Але гэта калі не ведаць, што ў XIX стагоддзі тут была шыкоўная сядзіба Біспінгаў. Незвычайны дом спалучаў рысы ампіру і несапраўднай готыкі. Але сёння яго няма. У 1970-я гады сядзіба была так перабудавана, што сёння яе пазнаць амаль немагчыма. Пра былы шык нагадваюць хіба што прыгожыя гатычныя вокны, але і яны груба закладзеныя цэглай. Уяўленне пра тое, як выглядала сядзіба, даюць малюнкі відомага мастака Напалеона Орды 1860—1870 гадоў. Чым жа тады цікавыя Масаляны? Сядзібы няма, але ёсць краязнаўца Галіна Румак. Яна шмат гадоў вывучае гісторыю Масалян, дакладна ведае біяграфію Біспінгаў. Калі ўважліва яе паслухаць, уключыць фантазію і пагуляць па вакол ліцах, можна перанесціся ў мінулае, калі тут кіпела жыццё. Безумоўна, сядзіба дадала б такім вандроўкам больш каларыту, але як ёсць. Прыклады знішчэння падобных мясцін — важны ўрок гісторыі, але заданні па ім выконваць не варта. Масаляны — таму пацвярджэнне.

ГІСТАРЫЧНЫ КРЭАТЫЎ

Зусім адваротная сітуацыя ў гарадскім пасёлку Вялікая Бераставіца. Мястэчка вядома з 1495 года. Можна ўявіць, колькі ўсяго яно бачыла. Звесткі пра гэта сабраныя ў мясцовым музеі, вядомым як музей ваверкі. Дарэчы, адзіны ў Беларусі. Пры чым тут ваверка? Усё проста: на гістарычным гербе Вялікай Бераставіцы размешчана чырвоная ваверка пад залатой каронай. У 2006 годзе гэты герб быў зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Так ваверачка стала не толькі гераіняй анекдотаў, але і сімвалам горада. Існуе некалькі версій, чаму менавіта гэтаму звярку выпаў такі гонар. Першая празаічная: у гэтай мясцовасці шмат ваверак. Другая лагічная: ваверка — сімвал багацця. Трэцяя крапальная: любімую дачушку ўладальніка Вялікай Бераставіцы Ежы Аўгуста Мнішака дома называлі ваверачкай з-за яе гарэзлівага характару. Першыя дзве залы музея прысвечаны сімвалу горада. Наступныя — расказваюць пра гісторыю Бераставіцкага краю ад мінулага да сучаснага. Можна было б напісаць, пра што канкрэтна, але лепей адправіцца ў Вялікую Бераставіцу і убачыць усё на свае вочы.

Над гарадскім пасёлкам горда ўзвышаецца грандыёзны будынак касцёла Візітацыі Божай Маці. Гэты манументальны будынак відомы з 1615 года. Лічыцца, што яго пабудаваў віленскі кашталян Іераніім Хадкевіч для манастыра ордэна кармелітаў. У XVIII ст. пры храме з'явіліся шпіталь і школа. У сярэдзіне таго ж стагоддзя касцёл быў перабудаваны і стаў брутальнай раннебарочнай пабудовай. Сёння ад касцёла засталіся моцныя вежавыя сцены, амаль што руіны. У 1980-я гады было аб'яўлена аб адкрыцці дабрачыннага рахунку на рэстаўрацыю. Неабходную суму сабралі, пачаліся работы. Але ў 1992-м здарыўся вялізны пажар, дах і ўсё ўнутры храма згарэла. Засталіся толькі сцены, якія стаяць і сёння. Але ў чым парадокс? Усе прыехалі бачыць помнікі гісторыі адрэстаўраванымі, адноўленымі. Часам яны аддаюць гістарычнай сапраўднасці, а часам на іх месцы з'яўляецца новы будынак. Асаблівасць бераставіцкага касцёла ў тым, што яго сцены дыхаюць гісторыяй. Глядзіш на гэтую цэглу і разумееш, што яна была тут чатырыста

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

гадоў таму, такая ж самая. Гэты касцёл — жывы помнік гісторыі, помнік часу. Дык, можа, і не варта яго хаваць пад сучасны тынкоўкай?

КАХАННЕ, НАВУКА І ТВОРЧАСЦЬ

Паводле гісторыі горада Свіслач можна зняць цэлы серыял. У XVIII — пачатку XIX стагоддзя мястэчкам валодаў граф Вінцэнт Тышкевіч. Яго жонка Тэрэза Панятоўская, пляменніца апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, паставіла мужу ўмову, што пераедзе жыць у Свіслач, толькі калі яна стане «другой Варшавай». Закаханага і багатага Вінцэнта Тышкевіча доўга прасіць не прыйшлося: ён пачаў маштабную перабудову мястэчка. Так сфарміраваўся сучасны выгляд Свіслачы з яе арыгінальнай планіроўкай. Ад цэнтральнай плошчы вуліцы разыходзяцца пад абсалютна прамым вуглом. Найлепшыя замежныя архітэктары, запрошаныя Вінцэнтам, пабудавалі ў Свіслачы тэатр, стварылі цікавыя ўязныя брамы. Асобнай увагі заслугоўвае парк, які закладзены таксама Тышкевіч. Стварыўся ён, зразумела, па лепшых еўрапейскіх узорах: грабавыя алеі, акуратна пасыпаныя пяском сцежкі, «зялёныя» фігуры, бярозавы гай. Тут жа стаяў і дом самога графа, ад якога сёння, на жаль, засталося толькі падмурак. Ён закансерваваны, створана разбіўка пакояў у адпаведнасці з планам, які захаваўся. Вядома, што граф Вінцэнт Тышкевіч быў вялікім аматарам свят, часта ладзіў балі ў сваёй сядзібе. Мясцовы аматарскі калектыў прапануўае турыстам хоць бы крыху адчуць, як гэта было. Госці Свіслачы возьмуць урокі танцаў, у прыватнасці, паланэзу, пагуляюць у гульні, у якія гуляла свіслацкая знаць. Ну і проста адпачнуць у цяні векавых дрэў. Але дзеўча затрымліваца ў парку не варта — у Свіслачы яшчэ ёсць на што паглядзець.

Нашы продкі лічылі, што той, хто зойдзе ў гэтае дупло з аднаго боку, а выйдзе з іншага — вылечыцца ад усіх хвароб, праўда, пры ўмове, што ён возьме новая імя. Нядрэнны варыянт для тых, хто з кожнага пакідзелка планує пачаць новае жыццё.

Напрыклад, на корпус знакамітай свіслацкай гімназіі. Праўда, пагляджэць на яго можна толькі звонку. Сёння ў гэтым корпусе бальніца. А пра мінулае нагадваюць велічныя калоны і памятная дошка на сцяне. З'явілася гімназія, як і многае ў Свіслачы, дзякуючы Вінцэнту Тышкевічу. Менавіта ён даў грошы на будаўніцтва навучальнай установы, а калі ў 1827 годзе гімназія была пабудавана, падарыў бібліятэцы шмат кніг. На вечар сустрэчы выпускніцкай свіслацкай гімназіі маглі б сабрацца людзі, чые прозвішчы вядомыя не толькі ў Беларусі: Юзаф і Каятан Крашэўскія, Ян Чачот, Напалеон Орда, Іосіф Кавалеўскі, Станіслаў Горскі, Рамуальд Траўгут. Лёс самага знакамітага выпускніка свіслацкай гімназіі Кастуся Каліноўскага цесна звязана з гэтымі мясцінамі. У вёсцы Якушоўка захаваўся падмурак дома, дзе ён правёў дзяцінства і дзе выдаў сем нумароў газеты «Мужыцкая праўда». Літаральна праз дарогу ад былой гімназіі размешчана алея герояў, дзе стаяць помнікі людзям, якія ўвасабляюць сабой розныя гістарычныя перыяды. Тут жа помнік і Іосіфу Сталіну, дарэчы, адзіны ў Беларусі.

